**УДК 332.36**

**Казінец М. Ц.**
к.э.н., дацэнт,
дацэнт кафедры менеджменту,
УА «Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт»

# АСНОЎНЫЯ ТЫПОВЫЯ ЧЫННІКІ ПАГАРШЭННЯ ФІНАНСАВАГА СТАНУ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ

У апошні час, не гледзячы на значныя намаганні ў галіне падтрымкі беларускіх вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі, эфектыўнасць функцыянавання апошніх пакідае жадаць лепшага. Дадзеныя дэманструюць нестабільную дынаміку паказчыкаў эфектыўнасці арганізацый сельскай гаспадаркі. Акрамя гэтага, звяртае на сябе ўвагу факт таго, што выніковасць дзейнасці, якая вымяраецца на падстве дадзенага паказчыка, ў названай галіне значна ніжэй, чым у іншых сектарах (у прыватнасці ў прамысловасці і на транспарце), а таксама ў сярэднім па нацыянальнай эканоміцы Рэспублікі Беларусь:

*Табліца 1*

**Галіновая рэнтабельнасць продажу, %**

| галіновая прыналежнасць | 2016 | 2017 | 2018 | 2019 |
|---|---|---|---|---|
| прамысловасць | 8,0 | 9,3 | 8,4 | 8,2 |
| сельская гаспадарка | 2,2 | 6,3 | 3,7 | 3,9 |
| транспарт | 9,7 | 9,8 | 10,9 | 7,8 |
| Усяго па відах эканамічнай дзейнасці | 7,3 | 8,1 | 7,5 | 6,9 |

*Источник: [1]*

Азначанае з’яўляецца, у тым ліку, вынікам дзеяння шэрагу спецыфічных чыннікаў, якія характэрны для сельскагаспадарчай вытворчасці.

Негатыўныя тэндэнцыі выклікаюцца акрамя знешніх фактараў чыннікамі, якія сфармаваліся ва ўнутраным асяроддзі функцыянавання арганізацыі і маюць аб’ектыўную базу. Да іх, у тым ліку, можна аднесці высокую вагу асушаных зямель у гаспадараках (характэрна для асобных тэрыторый беларускага Палесся, у прыватнасці Ганцавіцкага, Кобрынскага і некаторых іншых раёнаў). Гэта пры інтэнсіўным іх выкарыстанні прыводзіць да страт прадуктыўнасці. Акрамя гэтага, яны з’яўляюцца вельмі адчувальнымі да ваганняў надвор’я і патрабуюць да сябе асаблівай увагі і, адпаведна, фінансавых укладанняў.

У якасці фактараў, якія аказваюць негатыўны ўплыў на паказчыкі эфектыўнасці функцыянавання арганізацый, варта таксама аднесці перманентны дэфіцыт сродкаў, які прыводзіць да няпоўнай адпаведнсці тэхналогіі сельскагаспадарчай вытворчасці. Так, у прыватнасці, пакідае жадаць лепшага расход кармоў на адзінку прадукцыі. Аналагічнае заключэнне можна зрабіць і адносна выкарыстання сродкаў абароны раслін і жывёл, мінеральных угнаенняў і г.д.

Парушэнне тэхналагічных рэгламентаў ў вытворчасці, недапрацоўкі ў кормавытворчасці з’яўляюцца асноўнымі чыннікамі недабору жывёлагадоўчай прадукцыі, неапраўданага росту выдаткаў на вытворчасць і непрадукцыйнае выбыццё жывёлы. У такіх выпадках, як правіла, мае места нізкі надой на карову і сярэднесутачнае прыбаўленне вагі БРЖ.

Негатыўную ролю адыграе прырост фінансавых абавязацельстваў. Гэта з’яўляецца следствам, у тым ліку, росту пратэрмінаванай крэдыторскай запазычанасці.

У перыяд рэалізацыі інвестыцыйных праектаў (мадэрнізацыі і рэканструкцыі фермаў), часцяком ажыццяўляецца перабазаванне статка з часовым утрыманнем яго не ў поўнай меры аптымальных умовах. Вынікам гэтага з’яўляецца недастатковы рост сярэдняга надою на адну жывёлу і сярэднесутачнага прыроста вагі мяса.

Стан вытворча-тэхнічнай базы сельгасарганізацый характарызуецца недахопам і маральным састарэннем тэхнікі, часцяком недастатковай тэхнічнай гатоўнасцю да сельскагаспадарчых работ, што вельмі адмоўна адбіваецца на эфектыўнасці дзейнасці. Увод сучаснай шматфункцыянальнай тэхнікі абцяжараны адразу з-за высокіх іх кошту і выдаткаў па наступнаму сэрвісу, недахопу кваліфікаваных кадраў для іх абслугоўвання і інш. У выніку маюць месца парушэнні тэрмінаў сяўбы.

Да найбольш значных фактараў, у тым ліку якія аказваюць уплыў на пагаршэнне фінансавага стану арганізацый, варта аднесці:

– адхіленні ад тэхналогіі і арганізацыі сельгасвытворчасці;

– выкарыстанне ў значнай ступені састарэлых тэхнікі і абсталявання;

– недастаткова аптымальныя аб’ёмы вытворчасці прадукцыі і прадукцыйнасць працы;

– зніжэнне ўраджайнасці сельскагаспадарчых культур;

– нізкую прадуктыўнасць жывёл;

– адносна высокі ўзровень матэрыялаёмістасці;

– рост сабекошту адзінкі прадукцыі;

– недастаткова высокую эфектыўнасць кіравання асноўнымі сродкамі;

– недастатковую матывацыю персаналу.

Да асноўных вонкавых умоў, якія ўплываюць на эфектыўнасць дзейнасці суб’ектаў у сельскай гаспадарцы, якія незалежаць ад гаспадарчай дзейнасці, варта аднесці:

– ўзровень інфляцыі і палітыку ў галіне коштаўтварэння;

– рост выдаткаў на вытворчасць у сувязі з набліжэннем коштаў на паліўна-энергетычныя рэсурсы і імпартную сыравіну да сусветных;

– прадастаўленне мер дзяржаўнай падтрымкі па датаванню, кампенсацыям і інш.;

– манапалізм і дамінаванне асобных арганізацый, якія вырабляюць матэрыяльна-тэхнічныя рэсурсы для сельскай гаспадаркі;

– абмежаванасць канкурэнтных прапаноў (манапалізм) перапрацоўчых прадпрыемстваў галіны АПК;

– узровень крэдытавання і сістэму лізінгу сельскагаспадарчай тэхнікі;

– сістэму падаткаабкладання ў сельскай гаспадарцы;

– аграрнае заканадаўства, ахоўныя мыты і тарыфы для забеспячэння абароны ўнутранага харчовага рынку.

На магчымасць пагашэння крэдытных абавязацельстваў, у тым ліку крэдыторскай запазычанасці, аказваюць уплыў, перш за ўсё, наступныя фактары:

– ўмовы надвор’я, якія здольны значна знізіць альбо павысіць ураджайнасць і валавы збор сельскагаспадарчых культур у раслінаводстве;

– кошт кармоў і ступень эквівалентнасці абмену паміж сельскай гаспадаркай і ресурсавытворчымі галінамі АПК, у тым ліку суадносіны цэн на прамысловую і сельскагаспадарчую прадукцыю;

– сезоннасць сельскагаспадарчай вытворчасці;

– дзяржаўная палітыка па стымуляванню сельскагаспадарчай дзейнасці (прадастаўленне ільготных крэдытаў і пазык сельгасвытворцам, гарантаванне вяртання сродкаў, прадстаўленне адтэрміновак і растэрміновак па плацяжах і г.д.);

– падыходы да развіцця сацыяльнай інфраструктуры ў вёсцы, сельскіх мясцовасцях і тэрыторыях;

– іншыя незалежныя ад арганізацыі фактары.

Улік ўплыву названых вышэй фактараў на мікра-, меза- і макраўзроўні пры ўмове рэалізацыі належных мерапрыемстваў тактычнага і стратэгічнага характару здольны забяспечыць рост эфектыўнасці функцыянавання сельскагаспадарчых арганізацый Рэспублікі Беларусь.

**Спіс літаратуры**

1. Інтэрактыўная інфармацыйна-аналітычная сістэма распаўсюджвання афіцыйнай статыстычнай інфармацыі [Электронны рэсурс] / Нац. статыст. кам-т Рэсп . Беларусь. – Рэжым доступу: http://dataportal.belstat.gov.by. – Дата доступу: 20.06.2020.

**УДК 336.27:338.242.4:631**

**Осіпова А. А.**
викладач кафедри економіки,
Уманський національний університет садівництва

## КРЕДИТУВАННЯ ЯК ПЕРСПЕКТИВНИЙ НАПРЯМ ДЕРЖАВНОЇ ПІДТРИМКИ СІЛЬСЬКОГОСПОДАРСЬКИХ ВИРОБНИКІВ

Сільськогосподарське виробництво є важливою галуззю економіки України, від ступеня розвитку якої залежить добробут значної частини населення країни та її продовольча безпека. Збереження потенціалу сільськогосподарського виробництва в непростих умовах господарювання стає можливим завдяки різним заходам державної фінансової підтримки, в тому числі шляхом здешевлення кредитів. Відтак наразі у рамках державної підтримки розвитку сільськогосподарського виробництва країни діє механізм часткової компенсації відсоткової ставки за залученими у національній валюті банківськими кредитами.

Системі кредитування сільськогосподарського виробництва притаманна низка важливих особливостей, що зумовлюють зниження ефективного попиту та своєчасної пропозиції фінансових ресурсів. В першу чергу це високі ризики, характерні для даної галузі – об’єктивна залежність сільського господарства від природно-кліматичних і погодних умов, значний ціновий диспаритет галузей сільського господарства і переробної промисловості. Однак саме агрокредитування в умовах ринкового механізму господарювання є активним інструментом державного регулювання сільськогосподарського виробництва, що забезпечує формування ефективної ринкової системи, а також використання факторів економічного зростання.

Звертаючись до зарубіжного досвіду державної підтримки через кредитування, варто зосередити увагу на канадській моделі державної підтримки працівників сільського господарства. В основі її провадження – політика пільгового кредитування, яку країна використовує з 1959 р. Спрощений доступ до коштів сприяв суттєвому підвищенню рівня інноваційного технікотехнологічного забезпечення фермерських господарств та ефективності їх функціонування, що дало змогу Канаді вийти до когорти світових лідерів експорту сільськогосподарської продукції. Водночас недоліком канадської моделі підтримки сільського господарства є досить тривалий період (50 років) очікування ефективних результатів від товаровиробників і постійно зростаюча заборгованість підприємців перед державними кредиторами (банками) [1].